Юхневіч В.Л., студ. гр. 112 ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бабко А.І.,
канд. філас. навук, дацэнт

# МЯНЕ НЯМА? (ПРАБЛЕМА СЭНСУ ЖЫЦЦЯ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ)

*To be or not to be – this is the question.*

*У.Шэкспір*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хто такі чалавек? Задаўшы сабе гэтае пытанне, мы смела можам сказаць: чалавек - гэта я. Адгэтуль вынікае наступнае пытанне: а хто я? Для чаго я жыву? У чым сэнс майго жыцця?

Чалавек схільны шукаць адказы на пастаўленыя вышэй пытанні дзесьці па-за сабой, у іншага чалавека, у кнізе. А тымчасам галоўнай крыніцай адказаў з'яўляецца... ён сам. Варта тут прывесці выказванне святога Аўгусціна (354 – 430): «Не ідзі навонкі, у сябе ўвайдзі, бо ўнутры чалавека ісціна жыве». Дакладна тое ж раіць нам выбітны псіхолаг і чалавеказнаўца XX стагоддзя Карл Густаў Юнг.

Сярод беларускіх філосафаў, якія ўздымаюць праблематыку сэнсу жыцця, варты асаблівай ўвагі Валянцін Акудовіч, аўтар нашумелай кнігі «Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека». Ужо сама назва здзіўляе. Што значыць «мяне няма»? Гэтае, на першы погляд, абсурднае сцверджанне, хавае ў сабе, як аказваецца, нейкі пасыл. Вось ужо на самым пачатку кнігі Акудовіч дае нам падказку, што можа значыць гэтае «няма»: «Я — гэта семдзесят кіло костак, тлушчу, цягліц і вадкасці чырвонага колеру». Акудовіч, найвідавочней, хоча сказаць, што чалавек ёсць целам і нічым болей. А паколькі цела чалавека раней ці пазней распадаецца, то можна сказаць, што чалавека ў нейкім сэнсе «няма».

Як казаў нямецкі філосаф, Марцін Гайдэгер, чалавек – быццё-скіраванае-да-смерці. Гэта кволае і безабароннае жыццё. Да прыкладу можна прывесці невялікую рэфлексію катастрофы, якая адбылася пад Смаленскам 10 красавіка 2010 г. : самалёт Ту-154М ВПС Польшчы, які выконваў рэйс з Варшавы у Смаленск для наведвання катыньскага мемарыяла, пацярпеў крушэнне пры заходзе на пасадку на аэрадром Смаленск-Паўночны. У выніку катастрофы загінулі ўсе 96 асоб, якія знаходзіліся на борце: 89 пасажыраў і 7 членаў экіпажа. Гэтым падцвярджаюцца словы Марціна Гайдэгера. Ніхто ў дасканалай ступені не ведае, што будзе заўтра, але канец ва ўсіх адзіны.

Але ці сапраўды чалавек – гэта толькі косці, тлушч, цягліцы, вадкасць і нічога болей? Мне здаецца, што нават сам Акудовіч у гэтым не ўпэўнены. Калі б ён быў у гэтым упэўнены, то павінен быў бы на гэтым месцы завяршыць сваю кнігу. Але ён, як бачым, пачынае абмяркоўваць погляды самых розных філосафаў (гл. частка «Апошнія людзі»). Што праўда, ён крытыкуе іх, кажа, што ніхто з іх так і не здолеў паказаць той сапраўдны сэнс, але пры больш уважлівым чытанні можам заўважыць, што сама кніга «Мяне няма» з'яўляецца спробай знайсці якісьці сэнс. Што тычыцца самой назвы кнігі, то яе сэнс я б хацела вызначыць, працытаваўшы словы беларускага філосафа і багаслова Пятруся Рудкоўскага: “Гэтыя словы мог вымавіць толькі той, хто, дашчэнту змучаны барацьбой са сваім павуціньнем і сваім Богам, пачынае помсціць самому сабе за сваю звышсмелую ініцыятыву”.

Мне здаецца, што Акудовіч паставіў сабе нерэальную задачу: ахапіць сэнс жыцця выключна пры дапамозе розуму. Тое ж самае тычыцца і яго поглядаў на Бога. А тымчасам згаданы вышэй Карл Юнг падкрэсліваў, што апроч розуму, чалавек мае яшчэ і інтуіцыю, а таксама пачуцці і волю. І яны таксама павінны выкарыстоўвацца ў асэнсоўванні свету. І яшчэ адну памылку – на маю думку – робіць Акудовіч: ён шукае сэнсу ў іншых філосафаў, а тымчасам, як я ўжо

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўважыла на пачатку, трэба больш глядзець у сваё нутро, як тое раяць святы Аўгусцін і Карл Юнг.

Дазволю сабе сфармуляваць сваю думку адносна сэнсу жыцця і веры ў Бога. Я веру не толькі ў сябе і свае сілы ў гэтым жыцці, але і ў “той свет”, а менавіта, у Бога. Існуе вялікая колькасць гіпотэз наконт гэтага. Рычард Докінс, напрыклад, лічыць, што вера ў Бога – гэта «заразлівы вірус, які скача ад розуму да розуму». Паводле Брытанскай Энцыклапедыі, каля 4 % насельніцтва планеты не верыць у якую-кольвечы звышнатуральную моц. Яшчэ некалікі працэнтаў схільны ўстрымлівацца ад адказаў на гэта пытанне. У кожнага ёсць права на ўласную думку, і я паважаю перакананні атэістаў. Але не пагаджаюся з такой пастаноўкай справы, што вера - гэта якісьці тэрор або здзекі над сабой. Вера ў штосьці вышэйшае толькі дапамагае людзям быць лепшымі, спараджаючы ў ім адчуванне годнасці, чалавечнасці, таго што ўсе мы роўныя перад Богам. Гэта прызнае нават атэістычны філосаф Дэніэль Дэнэт, падкрэсліваючы, што рэлігія нярэдка падштурхоўвае чалавека да высокіх дзеянняў.

Трэба, аднак, прызнаць, што ў XXI стагоддзі не так проста верыць і захаваць адчуванне сэнсу жыцця. І справа тут не толькі ў тым, што становіцца ўсё больш і больш людзей, абыякавых да веры і такіх, якія не задумваюцца над сэнсам свайго жыцця. Вялікую ролю адыгрывае прагрэс навукі і тэхнікі. Гэта, безумоўна, добра, што гэты прагрэс адбываецца. Але многія людзі пачынаюць успрымаць гэты прагрэс як нейкае збаўленне, як панацэю на ўсе – духоўныя і матэрыяльныя – праблемы чалавека. І тут хацелася б зацытаваць глыбокія словы нямецкага філосафа Макса Шэлера, якія гэтаксама з'яўляюцца эпіграфам да кнігі Акудовіча: “У нашую эпоху чалавек упершыню зрабіўся цалкам і поўнасцю праблематычным для самога сябе; ён ужо не ведае, хто ён, але разам з тым ведае, што ён гэтага не ведае”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чалавек павінен паставіць перад сабой мэту: зразумець, хто ён у гэтым жыцці, дзеля чаго ён жыве.

Літаратура:

1. Акудовіч В. “Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека”/В.Акудовіч.- Мінск,1998.

Рудкоўскі П. “Мяне няма”- роздум інквізітара на руінах Акудовіча/ П.Рудкоўскі.- Наша вера-2005-№4(34).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ